# РЭФЕРАТ

Отчет 123 с., 1 кн., 74крын.

БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР, ЗААЛАГІЧНЫ КОД, МІФАПАЭТЫЧНАЕ МЫСЛЕННЕ, ГЕНЕЗІС, СІМВАЛ, ВОБРАЗ, ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ, КАРЦІНА СВЕТУ, МАДЭЛЬ СВЕТУ, СЕМІЯТЫЗАЦЫЯ.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца беларуская (шырэй – славянская) традыцыйная духоўная культура XIX –пач. XXI стст.

Мэта працы – вызначэнне генезісу, сімволікі і спецыфікі функцыянавання заалагічнага кода беларускай традыцыйнай духоўнай культуры на аснове абагульненняў новых дасягненняў фальклярыстыкі, этналінгвістыкі, семіётыкі, кагнітыўнай антрапалогіі і культуралогіі.

Метадалогія правядзення працы – этнасеміятычная; асноўныя метады – гісторыка-генетычны і функцыянальна-семантычны.

У працэсе працы актуалізаваны прынцыпы сістэмнага падыходу да даследавання заалагічнага кода беларускай традыцыйнай культуры, эксплікаваны адпаведны катэгарыяльнага апарат,выяўлены генезіс, сімволіка і функцыянальнасць груп арніталагічных, тэрыялагічных сімвалаў, а таксама гадаў, насякомых, рыб і свойскіх жывёл як чыннікаў заалагічнага кода беларускай традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў.У выніку даследавання ўпершыню ў беларускай фальклярыстыцы створана канцэпцыя генезісу і функцыянавання заалагічнага кода як сродка мадэлявання традыцыйнай карціны свету беларусаў (па фальклорных запісах XIX– пач. XXI стст.).

Вынікі даследавання ўкаранёны ў адукацыйны працэс УА "БрДУ імя А.С. Пушкіна"і іншых устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь, што дазваляе павысіць узровень прафесійнай кампетэнцыі педагогаў, кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры, развіць экалагічнае мысленне, маральныя і эстэтычныя якасці вучняў, забяспечыць студэнтаў філалагічнага і гістарычнага факультэтаўнайноўшымі навуковымі ведамі пра коды беларускай традыцыйнай культуры.

Вынікі могуць быць развіты ў накірунку міждысцыплінарнага і параўнальна-тыпалагічнага даследавання семіясферы беларускай традыцыйнай культуры, выкарыстаны ў практыцы выкладання фальклярыстыкі, этналогіі, славянскай і беларускай міфалогіі, стварэння метадычных дапаможнікаў, даведнікаў, а таксама для захавання і актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.